# АСАБЛІВАСЦІ ВЯРТАННЯ КУЛЬТАВЫХ БУДЫНКАЎ ВЕРНІКАМ У БССР ВА ЎМОВАХ ПЕРАБУДОВЫ

**Мазец Валянцін Генрыхавіч**
вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторы
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

Паваротным пунктам ва ўзаемаадносінах дзяржавы і канфесій у часы перабудовы з’явілася прынятая 22 студзеня 1987 г пастанова “Аб стане кантролю за захаваннем заканадаўства аб рэлігійных культах у Беларускай ССР”. На пра-



…й архив библиотеки МГУ имени А…

цягу 1987 г. на старонках газет і часопісаў з'явіліся артыкулы, у якіх выкрываліся факты ўшчамлення інтарэсаў рэлігійных абшчын і вернікаў. Гэта выклікала актывізацыю служыцеляў культу і вернікаў, накіраваную ў першую чаргу на адкрыццё культавых будынкаў. Так, за за 1987 год Упаўнаважанаму Савета па справах рэлігій па Беларускай ССР паступіла 105 адпаведных заяў. Праваслаўныя вернікі дамагаліся адкрыцці цэркваў у 18 населеных пунктах, у асноўным Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, а каталікі – у 19 населеных пунктах Гродзенскай, Віцебскай і Мінскай абласцей. З кожным годам з'яўляліся ўсе новыя адрасы. Упершыню паступілі заявы аб адкрыцці цэркваў у вёсках Рэмель Столінскага раёна, Вярбовічы Нараўлянскага, Маркавічы Гомельскага, Высокае Шклоўскага раёна, Мсціславе, гарадскім пасёлку Бераставіца і касцёлаў – у вёсках Палац Дзятлаўскага раёна, Галынка Гродзенскага, г.Вілейка. Каталікі г п. івянец за 1987 год па гэтым пытанні даслалі 23 заявы, яны ж звярталіся да XXVII з'езда партыі, з г. Паставы паступіла 8 заяў і 5 тэлеграм. [1, арк.7]. У в. Струга Столінскага раёна, дзе даволі востра стаяла пытанне аб адкрыцці царквы, 48 праваслаўных вернікаў адмовіліся ўдзельнічаць у маі 1987 г у выбарах мясцовых саветаў народных дэпутатаў.

Пры гэтым уладамі зацягвалася прыняцце рашэння з падборам памяшкання для кнігасховішча рэспубліканскай бібліятэкі. Кнігі па-ранейшаму захоўваліся ў касцёле пгт івянец Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Вернікі з пытаннем аб вяртанні касцёла звярталіся ў адрас XXVII з'езда КПСС і XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. [2, арк.43–44].

Партыйнае кіраўніцтва рэспублікі было надзвычай занепакоена ростам актыўнасці вернікаў. Так, па даручэнні сакратара ЦК Кампартыі Беларусі В.А. Пячэннікава аддзелам прапаганды і агітацыі ЦК сумесна з абкамамі КПБ 13 красавіка 1988 г. была прааналізавана сітуацыя, якая склалася ў 38 населеных пунктах рэспублікі, адкуль у 1987 г. паступалі заявы грамадзян аб адкрыцці цэркваў і касцёлаў. Адначасова была арганізаваная выхаваўча-тлумачальная праца з насельніцтвам, у якую ўключыліся інфармацыйна-прапагандысцкія групы партыйных камітэтаў, партыйныя і савецкія работнікі, дэпутаты мясцовых Саветаў, навукоўцы, настаўнікі.

Рэакцыя вернікаў на дзеянні партыйных работнікаў была рознай. Так, у вёсках Лукі Карэліцкага, Новая Руда Гродзенскага, Параф'янава Докшыцкага, Граўжышкі Ашмянскага раёнаў, паводле меркавання партыйнага кіраўніцтва, становішча паляпшалася і былі спадзяванні, што вернікі не будуць у наступным дамагацца адкрыцця цэркваў і касцёлаў.

У шэрагу іншых населеных пунктаў вернікі былі настроеныя даволі рашуча, нават там, дзе былыя культавыя будынкі былі прыстасаваныя мясцовымі ўладамі для выкарыстання ў грамадска-карысных мэтах. Так, у будынку касцёла ў івянцы была размешчана кнігасховішча бібліятэкі ім. У.і. Леніна; у г. Мінску ў былой царкве па вул. Няміга – цэнтральная лабараторыя Галоўархіва ВССР, а па вул. Старажоўскай – Цэнтральны дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі БССР і Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва БССР; у г. Смаргоні ў былой царкве – краязнаўчы музей; у г. Паставы ў былым касцёле – вучэбна-вытворчы камбінат. Рыхтавалася дакументацыя



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на пераабсталяванне яго пад канцэртную залу, якую планавалася адкрыць у 1990 г.

У якасці сродку, які мог ускладніць працэс перадачы культавага будынка вернікам, уладамі выкарыстоўваліся рамонтна-рэстаўрацыйныя работы, якія ў 1988 г. праводзіліся у 8-мі будынках храмаў. Так, на працягу 1988 – 1989 гг будынак царквы ў в. Рэмель Столінскага раёна планавалася прыстасаваць пад Дом кнігі, а царквы ў г. Мсціславе – пад філіял абласнога краязнаўчага музея. Пад канцэртную залу ўлады збіраліся пераабсталяваць касцёл у в. Опса Браслаўскага раёна, а пад канцэртна-выставачную залу – касцёлы у в. Лаздуны іўеўскага раёна і г. Вілейка. У будынку царквы ў в. Гершоны Столінскага раёна меркавалася адкрыць музей атэізма, у царкве у в. Вербавічы Нараўлянскага раёна – маладзёжнае кафэ, а ў царкве ў в. Высокае Шклоўскага раёна – калгасны клуб. Яшчэ па 9-ці храмавых будынках партыйнымі органамі рыхтавалася дакументацыя на рамонтна-рэстаўрацыйныя работы [1, арк.17–18]. У шэрагу выпадкаў дадзеныя меры выклікалі павелічэнне актыўнасці вернікаў у дасягненні сваіх мэт, як напрыклад, у вёсках Рэмель і Асцярожнае Столінскага раёна, Опса Браслаўскага раёна.[1, арк.16]

Шэраг будынкаў цэркваў і касцёлаў рэспублікі нават з моманту зняцця з рэгістрацыі заставаліся ў руках вернікаў і любая спроба з боку ўладаў зрабіць гэта выклікала ў вернікаў рашучы пратэст. Такіх будынкаў у БССР у 2-й палове 1980-х гг. было 11 – цэрквы ў вёсках Дарапеевічы і Ляхаўцы Маларыцкага раёна, Веляцічы Пінскага, Варацэвічы іванаўскага раёна, касцёлы ў вёсках Германішкі Воранаўскага, Дуды іўеўскага, Нецеч Лідскага, Вялікая Рагозніца Мастоўскага, Сурынка і Кракотка Слонімскага, Старыя Васілішкі Шчучынскага раёнаў.

1 кастрычніка 1990 г. быў прыняты Закон СССР “Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях”, што выклікала істотны рост колькасці рэлігійных арганізацый. Так, у 1988 г. у рэспубліцы было зарэгістравана 195 абшчын, у асноўным праваслаўных і каталіцкіх. У пачатку 1991 г. дзейнічала 1095 рэлігійных аб’яднанняў, або на 438 больш, чым іх было ў сярэдзіне 1970-х гг., калі быў спынены працэс зняцця з рэгістрацыі і зачынення культавых будынкаў. Па абласцях рэлігійная сетка характарызавалася наступнымі дадзенымі: у Брэсцкай вобласці дзейнічала 358 рэлігійных аб’яднанняў, Віцебскай – 130, Гомельскай – 94, Гродзенскай – 258, Мінскай – 176, Магілёўскай – 67 і ў г Мінску – 12 рэлігійных абшчын. [3, арк. 37]

На працягу 1990 г. Упаўнаважаным Савета па справах рэлігій па Беларускай ССР не было выяўлена грубых парушэнняў заканадаўства аб свабодзе сумлення, а такім чынам, і не было адміністрацыйных пакаранняў. Праўда, былі факты незадаволенасці з боку вернікаў, звязаныя галоўным чынам са складанасцю вызвалення і перадачы ім культавых будынкаў. У Ваўкавыскім раёне, напрыклад, адступленне райвыканкама ад прававых нормаў пры рашэнні пытання аб спрэчным культавым будынку ў в. Вярэйкі стварыла канфліктную сітуацыю паміж праваслаўнымі вернікамі і каталікамі. Канфлікт быў уладжаны пры актыўным удзеле Камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах Вярхоўнага Савета БССР. Такі ж складаны вузел давялося развязваць у г. Полацку, дзе разгарэлася спрэчка паміж вернікамі розных рэлігійных



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

канфесій за будынак Сафійскага сабора. Тройчы збіраліся прадстаўнікі зацікаўленых бакоў і розных устаноў па гэтым пытанні, аднак канчатковага рашэння яшчэ да пачатку 1991 г. не было прынята.

У сувязі з тым, што ў рэспубліцы на той момант мелася 148 былых культавых будынкаў, не запатрабаваных вернікамі, то падобных спрэчак магло быць шмат. А так як шэраг з іх былі заняты пад сацыяльныя і культурныя патрэбы, то ў працэсе вяртання іх вернікам маглі ўзнікаць пэўныя складанасці. [3, арк. 43]

**Літаратура**


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4п. Воп. 157. Спр.162.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 7. Воп. 10. Спр.1434.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4п. Воп. 156. Спр. 848.


Электронный архив библиотеки МГУ имени